# Конкурсная праграма «Супер бабуля»
# для актыўныхах таленавітых пазітыўных жанчын
# (Ашмяны - Смаргонь)

04 сакавіка 2019 года у г. Смаргонь на конкурснай праграме «Супер бабуля» сустрэліся дзве жаночыя каманды залатога ўзросту. Гэта была новая цікавая сустрэча двух аддзяленняў дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту Ашмянскага і Смаргоньскага раёнаў.

Конкурсная праграма была напоўнена творчымі нумарамі, кулінарнымі шэдэўрамі, музычна-паэтычнымі творамі.

Усе ўдзельнікі гульні атрымалі граматы па намінацыях і каштоўныя падарункі, мора пазітыву і велізарны зарад бадзёрасці.

Супрацоўніцтва двух раёнаў стала добрай традыцыяй, яно дае нам магчымасць удасканальвацца, знаходзіць новыя творчыя ідэі, новыя знаёмствы і падтрымліваць актыўную жыццёвую пазіцыю людзей сталага веку.







